ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



№ 18 (900) | Серада, 6 снежня 1995г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## 10-ГА СНЕЖНЯ -- АПОШНІ ЭТАП ПАРЛАМЕНЦКАГА МАРАФОНА

Лісток календара за 29-га лістапада не быў пазначаны як святочны. Але гэты дзень стаў нерабочым. У мінулую сераду праводзіліся другі тур выбараў у Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь і выбары ў мясцовыя Саветы.

Больш за ўсё хвалявалі нас вынікі выбарчай кампаніі ў заканадаўчы орган -- парламент. Менавіта ад таго, ці ўдасца сфарміраваць яго, у многім залежыць будучыня нашай незалежнай суверэннай дзяржавы.

Са сродкаў масавай інфармацыі стала вядома, што выбары адбыліся па ўсіх выбарчых акругах Беларусі і прайшлі дэмакратычна, на парадўнаўча высокім арганізацыйным узроўні. Выбрана 20 дэпутатаў беларускага парламента. А каб ён стаў паўнамоцным, яго мандаты павінны атрымаць яшчэ не менш 35 прэтэндэнтаў у вышэйшы орган дзяржаўнай улады.

На апошнім этапе парламенцкай барацьбы ў 119 выбарчых акругах будуць сапернічаць 238 кандыдатаў у дэпутаты. Сярод іх -- дырэктар Інстытута лесу Акадэміі навук Беларусі, член партыі камуністаў Беларусі В.А.Іпацьеў і старшыня Цэнтральнага райвыканкома г.Гомеля беспартыйны У.У.Давідовіч. З шасці прэтэндэнтаў, якія балаціраваліся ў Вярхоўны Савет па Гомельскай-Цэнтральнай выбарчай акрузе N 86, куды ўваходзяць і выбарчыя ўчасткі N22 і N26, што размяшчаюцца ў вучэбных карпусах №1 і №2 нашага універсітэта, яны набралі найбольшую колькасць галасоў. У прыватнасці, за В.А.Іпацьева іх аддалі 4042 выбаршчыкі, за У.У.Давідовіча -- 2583. Каму ж з іх аддадуць перавагу на апошнім этапе выбараў, мы даведаемся праз лічаныя дні.

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:


- 1-2
**Як прайшлі выбары. Навіны універсітэцкага жыцця.**
- 3.
**Умацоўваюць сувязі навукоўцы.**
- 4.
**Аб паходжанні назвы г.Гомеля разважае гісторык з Эстоніі.**
- 5.
**Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці -- надзённая праблема.**
- 6.
**Як жывуць студэнты ў г.Абердзіне.**
- 7.
**Пра кінамастацтва і музыку.**
- 8.
**Спорт. Цырк. Паэтычная паверка.**


## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

29-га лістапада адбылося чарговае ў бягучым навучальным годзе пасяджэнне Савета універсітэта. Заслухана і абмеркавана справаздача дэкана філалагічнага факультэта дацэнта У.Д. Еўтухова аб навукова-даследчай рабоце кафедр і падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў.

Вучоны сакратар Савета Л.Я.Палякоў выступіў з інфармацыяй аб атэстацыі навукова-педагагічных работнікаў па прысваенню вучоных званняў і мерах па яе ўдасканаленні.

Найбольш высокакваліфікаваным і вопытным кандыдатам навук Савет дазволіў кіраваць аспірантамі.

На конкурснай аснове на вакантныя пасады абраны дацэнтамі: С.І.Голік -- па кафедры ВМ і праграміравання, Д.П.Юшчанка -- па кафедры матэматычнага аналізу, Я.Б.Шаршнёў -- па кафедры оптыкі /0,25 стаўкі/, І.У.Сільчанка -- па кафедры псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі; старшымі выкладчыкамі: Т.М.Усольцава -- па кафедры рускай літаратуры, Н.А. Сняжкова -- па кафедры псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі, Т.А. Шафарэнка -- па кафедры геаграфіі.

Кандыдат эканамічных навук Б.У.Сарвіраў з кафедры эканамічных тэорый рэкамендаваны Атэстацыйнай калегіі Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь да прысваення вучонага звання дацэнт.

## ПЕРСПЕКТЫВА ЦЕСНАГА ЗБЛІЖЭННЯ

У пачатку мінулага года была распрацавана і падпісана сумесная беларуска-італьянская праграма па стварэнню ў Гомельскай вобласці псіхалагічнай службы. Яе ажыццяўленне пачалося з падрыхтоўкі псіхолагаў на базе нашага універсітэта з ліку студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей. Неабходных спецыялістаў пачаў выпускаць і факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў.

(ЗАКАНЧЭННЕ НА 3 стар.)

## *ВІНШУЕМ!*

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты матэматычнага факультэта горача віншуюць асістэнта кафедры матаналізу* ***КАЗІМІРАВА Рыгора Мікалаевіча*** *з выпадку паспяховай ім абароны дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.*

## *З УЗНАГАРОДАЙ!*

*За шматгадовую плённую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці загадчык кафедры батанікі і фізіялогіі раслін прафесар* ***САПЕГІН*** *Леанід Міхайлавіч узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.*



Гэты здымак быў зроблены 15 лістапада г.г. -- у дзень здкрыцця Франка-беларускага інстытута кіравання. Шматлікія госці мелі магчымасць азнаёміцца з выстаўкай навуковай і тэхнічнай прадукцыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў нашага універсітэта.

На здымку: другі справа -- старшыня Гомельскага аблвыканкома П.У.Шыпук, трэці -- пасол Францыі ў Рэспубліцы Беларусь Клод Жаліф. Тлумачэнні дае загадчык кафедры АСАІ дацэнт А.М.Дзэмідзенка.

Фота У.Чысціка.

# ТЭХНІЧНАЯ ДАПАМОГА ДЛЯ НОВАГА ІНСТЫТУТА

У апошні час наш універсітэт усё больш упэўнена выходзіць на міжнародную арэну, пашырае навукова-педагагічныя сувязі з замежнымі краінамі. Гарантам гэтага стаў яго ўдзел у сумеснай міжнароднай праграме "ТЭМПУС", па якой партнёрамі ГДУ ў супрацоўніцтве з"яўляюцца універсітэт г.Клермон-Ферана /галоўны яе каардынатар/, універсітэт г. Бірмінгема /Англія/ і вышэйшая тэхнічная школа нямецкага горада Кіля.

Згодна гэтай праграмы заходнееўрапейскія краіны дапамагаюць нашай ВНУ ў развіцці матэрыяльнай базы, ўдасканальванні навучальнага працэсу, а нядаўна на базе ГДУ быў адкрыты Франка-беларускі інстытут кіравання.

Днямі універсітэт атрымаў тэхнічную дапамогу з Германіі. Фірма "GUTMANN" даслала Франка-беларускаму інстытуту абсталяванне для лінгафоннага кабінета агульным коштам на 20 тыс. нямецкіх марак. Правоз груза, усе дарожныя выдаткі аплаціў нямецкі бок, а каштоўны груз аператыўна прайшоў усе мытныя фармальнасці.

Т.ДУБЯК.

# НОВЫЯ КАФЕДРЫ

З 1-га лістапада г.г. на гісторыка-юрыдычным факультэце адкрыта новая кафедра: тэорыі і гісторыі дзяржавы і права. В.а. яе загадчыка загадам па універсітэту назначаны ст.выкладчык **ЖАГОРАЎ Сяргей Васільевіч.**

***

У гэтым навучальным годзе з кафедры нямецкай і французскай моў у асобную выдзелена кафедра французскай мовы. Яе ўзначаліў старшы выкладчык **ЧЭРКАС Васіль Васільевіч.**

# МАЛАДЗЁЖНАЙ ІНІЦЫЯТЫВЕ ПАТРЭБНА ПАДТРЫМКА

Прыцягнуць увагу грамадскасці і кіраўніцтва рэспублікі да праблем моладзі -- такая галоўная мэта Усебеларускага маладзёжнага форуму, які адбудзецца 27-29 снежня ў Мінску.

Ініцыятарам яго правядзення выступіла Усебеларуская нацыянальная рада маладзёжных і дзіцячых арганізацый.

Як паведаміў выканаўчы дырэктар рады Сяргей Юркевіч, плануецца ўдзел у гэтым грандыёзным мерапрыемстве прадстаўнікоў усіх маладзёжных арганізацый, аб"яднанняў, клубаў, а таксама калег з еўрапейскіх нацыянальных маладзёжных саветаў.

Будучы форум, паводле задумы арганізатараў, стане месцам, дзе будзе выпрацавана стратэгія ўзаемаадносін моладзі і дзяржавы. Таму што да гэтага часу з боку ўладных органаў вельмі мала ўвагі ўдзяляецца маладзёжнай палітыцы. Акрамя таго, яго правядзенне паслужыць наладжванню міжнародных кантактаў, дапаможа азнаёміцца з вопытам работы еўрапейскіх маладзёжных арганізацый. Паколькі няма дзяржаўнага фінансавання форуму, яго арганізатары запрашаюць усіх зацікаўленых асоб прыняць удзел у падрыхтоўцы мерапрыемства.

БелТА.

# НА "ДНЯХ ЭКАНАМІСТА"

Па старой традыцыі ў канцы лістапада прайшлі Дні эканамічнага факультэта. У чарговы раз сабраліся разам выкладчыкі, выпускнікі і цяперашнія студэнты. Актавая зала стала месцам сустрэч, зносін і адпачынку. Госці змаглі акунуцца ў свет казкі, якую прадставілі на суд гледачоў студэнты першага курса. Задор удзельнікаў, жарты, танцы дапамаглі выпускнікам нагадаць свае студэнцкія гады, а можа быць і выступленні на гэтай жа сцэне. На жаль, у канцэртнай праграме не прымалі ўдзел старшакурснікі і выпускнікі.

За актыўны ўдзел у правядзенні "Дзён эканаміст[illegible] удзельнікам быў уручаны вялізны торт, а таксама былі адзначаны прызамі Валянціна Шуб, Іра Геркусава і Тамара Каляда. Аднак можна спадзявацца, што за час сваёй далейшай вучобы ў сценах універсітэта і ў цесным супрацоўніцтве з культурным цэнтрам, цяперашнія першакурснікі ўсталююць сувязь пакаленняў і новыя традыцыі ў правядзенні "Дзён эканаміста". Пачатак адной з традыцый быў пакладзены ў гэтым годзе.

Першакурснікі Кірыл Кекіш і Алег Фёдараў правялі гульню "Рызыка-версія" паміж студэнтамі і выкладчыкамі. Было шмат вясёлых момантаў з-за дэбюта вядучага і каманд. Дарэчы, каманда студэнтаў фарміравалася прама ў зале, у яе ўвайшлі прадстаўнікі пяці факультэтаў.

У час невялікіх перапынкаў яшчэ больш настрой уздымалі выступленні СТЭМа.

Правядзенне "Дзён эканаміста" аб"ядноўвае ў адно цэлае і студэнтаў, і выкладчыкаў, і выпускнікоў. І гэта ў наш час асабліва важна і каштоўна.

К.БАГДАНАВА,
студэнтка IV курса, прафорг факультэта.



# ЛЕКЦЫЯ ПРАФЕСАРА З ЛОНДАНА

У нашым універсітэце адбылася лекцыя прафесара Лонданскага універсітэта Джыма Дзінглі, выкладчыка славянскіх моў і літаратур.

Усе слухачы былі ўражаны высокім узроўнем валодання прафесарам беларускай мовай, а потым яшчэ больш здзівіліся, калі даведаліся, што англійскія студэнты маюць магчымасць паслухаць лекцыі, акрамя, канешне, сваёй роднай і на іншых славянскіх мовах /польскай, украінскай, рускай/.

Мова і палітыка. Моўныя праблемы на Беларусі, іх сацыяльныя карані. Ці існуюць аналагічныя пытанні ў цывілізаваных краінах? Як "зліццё горада і вёскі" паўплывала на развіццё і статус мовы? Вось асноўны змест лекцыі прафесара Дзінглі, на працягу якой ён з дапамогай аўдыторыі шукаў адказ: хто ці што прымушае беларусаў выракацца сваёй мовы.

Разам з прафесарам нашага універсітэта У.В.Анічэнкам Джым Дзінглі падрыхтаваў падручнік беларускай мовы, па якім будуць вучыцца замежныя студэнты.

Будзем спадзявацца, што гэта быў не апошні візіт англійскага навукоўца на Беларусь. А ўзаемакарыснае супрацоўніцтва, нягледзячы на шматлікія перашкоды, звязаныя ў першую чаргу з палітычнай нестабільнасцю Беларусі, будзе працягвацца і пашырацца.

А.ЗАБАРОЎСКІ,
студэнт гр. Б-21
філалагічнага факультэта.

# 2000$
## МАЛАДЫМ ДАСЛЕДЧЫКАМ
/да 40 гадоў/

у галіне гісторыі, паліталогіі, сацыялогіі і эканомікі.

Маскоўскае аддзяленне Расійскага навуковага фонду пры садзейнічанні Фонду Форда /ЗША/ праводзіць III конкурс па грамадскіх навуках у Расіі і краінах СНД.

Праекты на конкурс прымаюцца да **15 студзеня 1996 г.**

З умовамі конкурсу і рэкамендацыямі па афармленню заявак можна азнаёміцца ў газеце "Поиск" за 9-15 верасня 1995 г., а таксама ў навуковым аддзеле ГДУ.

# УШАНАВАЛІ НА РЭКТАРАЦЕ

У апошнія гады студэнты нашага універсітэта паказваюць высокія спартыўныя вынікі, і ўжо стала добрай традыцыяй ушаноўваць на рэктаратах пераможцаў і прызёраў адказных спаборніцтваў. На гэты раз у рэктарат былі запрошаны студэнты факультэта фізічнай культуры Аляксандр Слюнькоў, Яўген Пудакоў, Валянцін Борсук і Дзмітрый Цуманкоў з філалагічнага факультэта, якія паспяхова выступілі ў розыгрышу Кубка Еўропы сярод юніёраў клубных каманд, а таксама Таццяна Аляксухіна, Аляксей Кашаедаў з факультэта фізічнай культуры і Юлія Каляда з гісторыка-юрыдычнага факультэта, якія заваявалі першае каманднае месца на спартакіядзе ВНУ па шматбор"ю "Здароўе". Усіх іх цёпла павіншаваў з дасягнутымі поспехамі рэктар універсітэта акадэмік Беларускай акадэміі адукацыі, член-карэспандэнт АН Беларусі Л.А.Шамяткоў, уручыў ім грашовыя прэміі, а выканаўшым запаветныя нарматывы -- значкі "Майстар спорту Рэспублікі Беларусь".

Аматарам паэзіі Гомеля добра вядома імя аўтара зборніка "Мелодыя душы" Эмы Усціновіч. У свой час яна закончыла нашу ВНУ і да ўходу на пенсію працавала настаўніцай. Эма Васільеўна рэгулярна сустракаецца са студэнтамі ГДУ, расказвае ім пра сваю педагагічную і паэтычную працу. На гэты раз яе з задавальненнем віталі студэнты-завочнікі II курса спецыяльнасці "Бухгалтарскі ўлік, кантроль і аналіз гаспадарчай дзейнасці". Сустрэча прысвячалася 52-й гадавіне з дня вызвалення горада над Сожам ад гітлераўскіх акупантаў.



На здымку: Э.Усціновіч чытае верш аб Гомелі.

Фота У. Чысціка.

# ПЕРСПЕКТЫВА ЦЕСНАГА ЗБЛІЖЭННЯ

(ЗАКАНЧЭННЕ.
ПАЧАТАК на 1-й стар.)

Істотную дапамогу ГДУ аказваюць у гэтай важнай справе вучоныя Пізанскага універсітэта і, у прыватнасці, прафесар Гаэтана Барлета.

За прайшоўшы час паміж гомельскімі і італьянскімі калегамі прыкметна пашырыліся і ўмацаваліся сувязі. Цесным кантактам садзейнічае ўзаемны абмен дэлегацыямі. Вось і ў апошняй дэкадзе лістапада Італію (па запрашэнню з поўнай аплатай расходаў) наведаў рэктар ГДУ акадэмік Беларускай акадэміі адукацыі, член-карэспандэнт АНБ Л.А.Шамяткоў. З яго ўдзелам у рэктарацe Пізанскага універсітэта абмеркавана шырокае кола пытанняў па далейшаму развіццю супрацоўніцтва. Леанід Аляксандравіч падрабязна расказаў, на якім узроўні яно цяпер знаходзіцца паміж ГДУ і універсітэтам г.Клермон-Феран, аб адкрытым у нас Франка-беларускім інстытуце кіравання і рэальнай магчымасці пайсці па такому шляху з італьянскім бокам, асабліва па гуманітарнай лініі. Тым больш, што аказаць дапамогу ў гэтым накірунку выказалася італьянская Служба сацыяльнай дапамогі насельніцтву. У г.Піза гатовы прыняць удзел у правядзенні стажыроўкі нашых выкладчыкаў па гуманітарных дысцыплінах, у летнім аздараўленні дзяцей, а таксама студэнтаў.

Разам з тым у рэалізацыі новага праекта ёсць і некаторыя складанасці. Яны датычацца фінансаў, валодання нашымі пасланцамі італьянскай мовай, некаторых іншых праблем. Як больш паспяхова іх вырашаць, пойдзе размова ў бліжэйшыя дні на чарговай сустрэчы з навуковымі работнікамі Пізанскага універсітэта, якая на гэты раз адбудзецца ў ГДУ.

Б.ВАЛОДЗІН.

## СТРАНИЦЫ ИСТОРИИ

**В наш университет пришло письмо из Эстонии от Ильмари Лахти, который на протяжении нескольких лет работал над поиском ответа на вопрос: почему наш город Гомель носит такое название. Ещё в 1991г. в тезисах II Гомельской областной научной конференции по историческому краеведению был опубликован реферат его доклада "О происхождении названия Гомель".**

**К настоящему времени эта тема приобрела завершённый вид. Получен исчерпывающий ответ на вопрос: Гомий и Гомель -- это два разных понятия или же понятия-близнецы и что они означают конкретно?**

**Автор предлагает нам свою статью "Город на высоком холме". В ней содержится интересная и познавательная информация об истином смысле названия нашего города.**

# ГОРОД НА ВЫСОКОМ ХОЛМЕ

Славянское племя радимичей выбрало местом своего обитания северо-западную оконечность Восточно-Европейской равнины. Равнина эта обильна моренными холмами -- порождениями ледника, отступившего более десяти тысяч лет тому назад. Холм -- поистине один из символов этого края. Если к тому же знатный холм находится на слиянии рек, то могли ли наши предки желать ещё лучшего места для закладки города? Поэтому совершенно естественно, что упомянутый впервые в летописи под 1142 годом Гомий был расположен именно на большом холме у слияния рек Сож и Ипуть.

Известны различные варианты названия современного Гомеля -- Гом, Гомьё, Гомей, Гомин. Одни видят в основе этих названий всем понятные слова "гомон", "гам" и поэтому увязывают их с шумом девственных лесов и воды, будто бы поразивших первооткрывателей этих краёв. Однако можно ли было поразить наших предков столь обыденными для них явлениями природы в такой степени, чтобы они перенесли название этого явления на город? Вряд ли подобное обстоятельство могло явиться веским доводом в пользу выбора места закладки города: оно скорее было бы на руку тем, кто захотел бы скрытно подобраться к городу. Вряд ли шум, как отличительный признак местности, мог послужить основой для названия города.

Отсутствуют аргументы и у авторов, предполагающих наличие связи между названием города Гомель с однокоренным названием некоторого доселе ещё неизвестного племени, первым заселившим этот район, либо с именем пока неизвестного нам героя. Рядом с Гомелем имеется город, на полтораста лет старше его, который носит имя исторического лица. Этот факт позволяет лучше понять историческую обстановку именно в начальный период существования Гомеля.

В 990 году Владимир Святославович отдаёт Святополку, усыновлённому племяннику, город Туров. Раскроем "Историю" Н.М.Карамзина. Оказывается: название города Туров, по летописным данным, произошло от имени Василия Тура, Варяга, приехавшего вместе с Рогволдом, который сам осел в Полоцке.

Перемещение германских племен по территории, совпадающей с Киевской Русью, отнюдь не сводится к хрестоматийному понятию о пути "из варяг в греки". Подобно перелётным птицам народы двигались с момента отступления ледникового покрытия с юга на север, а затем с севера на юг, причем повторяли этот маршрут неоднократно. Предки скандинавов тоже не являлись исключением из этого правила. В период со 182 по 215 год готы продвигались от Балтийского до Черного моря. В течение последующих полутора тысяч лет часть готов обитала в Крыму. Другая часть рассеялась, но не потерялась, по южной Европе. Об их влиянии на Старый Свет может вспомнить каждый из нас, вызвав в памяти образы готической архитектуры. Нет никакой сенсации в том, что в названии рек следы германских языков прослеживаются от Балтики до Киева.

В период возникновения Гомеля рядом друг с другом сосуществовало множество языков и групп языков: старославянский, тюркский, германский (готский, датский, к которому тогда относился и шведский), угрофинский и множество других. Взаимные заимствования из одного языка в другой были неизбежным и естественным результатом длительных языковых, торговых и других контактов, включая родственные связи.

Ключ к разгадке названия города лежит и поныне там, куда положили его радимичи, основатели города, а именно в буквальном смысле под ногами горожан.

Вспомним, что отличительной особенностью местного ландшафта являются холмы. Кстати, очень похожие на эстонские возвышенности -- Мунамяги, Карула, Отепяя (Медвежья голова), ибо те и другие являются порождением одного и того же мощного, до полутора километров, ледникового покрова. На гравюре XIX века изображен замок в Гомеле. Центральное место на гравюре занимает холм. Именно эта примечательная особенность края не могла остаться незамеченной наблюдательным и практичным оком основателей города. Именно особенность, особая черта лежит в основе названий народного происхождения.

Итак, основатели города выбрали местом его основания большой холм, выделявшийся своими размерами. Как на старославянском языке называлась холмообразная возвышенность, холм вообще? Очень просто -- "могилой". На сербохорватском языке наряду с "могилой" имело хождение и слово "гомила", равно как и на чешском "хомила". Это также является примером метатезы. Первоначальным общеславянским смысловым наполнением слова "могила" было "холм". Смысловой ряд слов "могила -- гомила -- Гомель" восходит к одному первоначальному понятию "холм". Это объяснение подтверждается и при ближайшем рассмотрении названия города Могилева. С одной стороны известно, что в этом районе соседствовало несколько городищ: Барсучья Горка, Змеевка и др. Следовательно, в районе Могилева сосредоточено несколько холмов. С другой стороны известно также, что название этого района -- Могилы, т.е. Холмы, имело хождение еще до основания города Могилева в 1267 году. Подобное точное совпадение по смыслу, по числу и по времени подтверждает однозначность толкования слова "могила" в смысле "природный холм".

Одинаковые характерные черты ландшафта вызывают у людей и одинаковую реакцию, независимо от исторической эпохи и координат местности.

**(Окончание будет)**



# НАВУЧАННЕ АСНОВАМ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ВЫХАВАННЯ

Сучаснае грамадства характарызуецца вядомым этнічным парадоксам. Ён праяўляецца ў тым, што ўсё большая інтэграцыя як матэрыяльнага, так і духоўнага жыцця народаў сусвету спалучаецца з паўсюдным ростам нацыянальнай самасвядомасці. У рэспубліцы Беларусь гэты працэс набывае больш значнае праяўленне ў сувязі з атрыманнем дзяржаўнай незалежнасці і суверэнітэту, адраджэннем нацыянальнай культуры. Але яшчэ не ўсе нашы грамадзяне асэнсоўваюць сябе беларусамі ў поўным разуменні гэтага слова, не ведаюць гісторыі сваёй краіны, яе звычаяў і абрадаў. Вось чаму так востра паўстае пытанне аб фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці нашых людзей. Педагогі павінны сёння сканцэнтраваць свае намаганні на авалоданні духоўным багаццем беларускага народа: яго культурай, мовай, традыцыямі, звычаямі і г.д. Існуюць розныя формы выхаваўчай работы ў гэтым напрамку. Некаторымі з іх авалодалі студэнты філалагічнага факультэта беларускага аддзялення, якія ў мінулым годзе праходзілі педагагічную практыку ў 22-й сярэдняй школе г.Гомеля.

Затрымаюся, па-першае, на конкурсах знаўцаў беларускай мовы і літаратуры. Іх падрыхтавалі і правялі студэнткі Г.Кузора, В.Карэлава, А.Зубкова і А.Старавойтава ў сёмых класах. Яны адбываліся ў выглядзе спаборніцтваў паміж дзвюма камандамі.

Усе заданні падбіралі студэнткі, карыстаючыся рознай займальнай літаратурай, а ад вучняў быў патрэбны актыўны ўдзел у конкурсах. Спачатку дзеці разгадвалі красворд, у якім былі зашыфраваны назвы беларускіх гарадоў у цікавым выглядзе: Г-М-Л-, -ШМ-Н-, Д-БР-Ш і г.д. Але вучні вельмі хутка падабралі галосныя літары да гэтых назваў, паказваючы сваё веданне родных мясцін. Потым рабяты атрымалі заданне перакласці шэраг слоў з рускай на беларускую мову, карыстаючыся слоўнікамі, і па першых літарах набытых слоў скласці назву вядомай аповесці У.Караткевіча. Напрыклад, са слоў далонь, загад, істота, кажан, агрэст, ежа выявілі слова "дзікае". Канечне, дзецям давялося трохі папацець, шукаючы ў слоўніках пераклады складаных рускіх слоў, бо моўны запас вучняў быў не вельмі значным. Затым дзеці паспрабавалі скласці прыказкі па парах слоў /каса-камень, галава-ногі, вада-брод/. А вось гэта ў іх атрымалася надта лёгка, амаль усе ведалі адпаведныя рускія прыказкі і хутка пераклалі іх. Значную цікавасць выклікала наступнае заданне -- рэбусы. Як, напрыклад, зразумець такую канструкцыю: ач/р ці КШ? А гэта "Нарач" і "каша". Рабяты прадэманстравалі ў гэтым выпадку сваю назіральнасць і кемлівасць. Усіх прысутных вельмі парадавала і апошняя праца спаборнікаў: па дадзеных рыфмах /сонца-аконца, сняжок-пушок/ яны прыдумалі добрыя жартоўныя вершы.

Гэтыя разнастайныя, складаныя і цікавыя заданні, як мы бачым, патрабавалі ад рабят напружання іх розуму і памяці, праяўлення значнай назіральнасці і дасціпнасці. Многія вучні зразумелі ў час спаборніцтваў, як добра могуць дапамагчы ім тыя веды, якія здабываюцца ў школе.

Безумоўным вынікам гэтага мерапрыемства варта лічыць, па-першае, развіццё інтэлектуальна-кагнітыўнага кампаненту нацыянальнай самасвядомасці асобы, дзякуючы пазнавальнай насычанасці праграмы спаборніцтваў. Але найбольш важным з"яўляецца другі вынік. Напружаная барацьба, зацікаўленасць кожнага ўдзельніка, перажыванне сваіх поспехаў і няўдач, маляўнічы выгляд заданняў, жартоўныя ўзнагароды -- усё гэта садзейнічала значнаму эмацыянальна-псіхалагічнаму ўздыму дзяцей, росту павагі і інтарэсу да роднай мовы і літаратуры, праяўленню першасных пазітыўных нацыянальных пачуццяў.

Аднак, каб садзейнічаць развіццю ўсіх структурных кампанентаў нацыянальнай самасвядомасці вучняў, настаўніку патрэбна праводзіць выхаваўчую работу сістэматычна, на працягу ўсяго навучальнага года, паступова пераходзячы ад яе простых да больш складаных і разнастайных формаў. Добрым прыкладам такога пераходу можна лічыць праведзеную студэнткай Н.Федзюковай у 8 класе "Беларускую гасцёўню". Яе асноўнай тэмай былі беларускія стравы, розныя ў кожную пару года і адпаведныя ім народныя гульні і абрады. Невялікая ініцыятыўная група дапамагала Надзеі рыхтаваць "Гасцёўню". Вучні шукалі матэрыял ў бібліятэцы, рабілі малюнкі страў, узнагароды для ўдзельнікаў, вучылі напамяць вершы, упрыгожвалі класны пакой ручнікамі з традыцыйнай беларускай вышыўкай і абрусамі.

Сваё свята дзеці пачалі з расказу аб зімовых стравах /баршчу, паліўцы, капусце, крупніку, мачанцы і іншых/, а потым правялі конкурс "Хто хутчэй з"есць куццю", якую звычайна елі на Каляды. Апісанне масленічных страў /бліноў і аладак/ завяршылася "Каснікам". Маецца на ўвазе старадаўняя гульня, у час якой дзве тройкі ўдзельнікаў павінны заплесці касу, не выпускаючы з рук шырокія стужкі. Не ўсё добра атрымалася ў рабят, але жартаў і смеху хапала.

Добры настрой усіх прысутных падтрымаў і наступны конкурс "Маляванне жаваронкаў", які праводзіўся пасля расказу аб стравах Велікадня /яйках, кулічу, мясе/. Нягледзячы на тое, што птушкі атрымаліся несамавітыя, малявалі іх весела і з захапленнем. Вельмі прыгожае і паэтычнае свята Купалля не мела, як паведамілі вучні, спецыяльных страў; галоўнымі тут былі абрадавыя гульні, карагоды і пошукі папараць-кветкі, якая абяцала шчасце і дабрабыт на ўсё жыццё. Два ўдзельнікі з класа паспрабавалі знайсці яе, а астатнія падбадзёрвалі іх крыкамі "холадна-горача".

Пятая частка свята была прысвечана шчодраму восеньскаму сталу і падрабязнаму апісанню ўсіх страў на дзень Дзядоў. Потым вучні правялі галоўны выніковы конкурс: на лепшага знаўца назваў беларускіх народных страў. Пераможцы атрымалі цікавыя ўзнагароды.

Гэта свята, безумоўна, зрабіла вельмі вялікае ўражанне на дзяцей і мела значныя вынікі. Яно, па-першае, садзейнічала развіццю пазнавальнага кампанента нацыянальнай самасвядомасці. Шмат якія звесткі былі для рабят новымі, займальнымі і цікаўнымі; дзеці набылі веды па гісторыі і культуры свайго роднага краю, пазнаёміліся з народнымі гульнямі і правіламі этыкету, запомнілі многія назвы беларускіх страў.

Акрамя гэтага, "Гасцёўня" закранула душу кожнага вучня сваёй маляўнічасцю, яркасцю і ўзнёсласцю. У класе не было раўнадушных дзяцей, іх рэакцыі на ўсе конкурсы і гульні былі непасрэдныя і жывыя. Не толькі незвычайная форма правядзення, але і змест матэрыялу, новыя звесткі аб продках, іх гасціннасці і павазе да людзей, шанаванні нябожчыкаў таксама садзейнічалі развіццю эмацыянальна-каштоўнаснага кампанента нацыянальнай самасвядомасці асобы, фарміраванню этнічных пачуццяў і поглядаў. Доказам гэтай думкі з"яўляецца тое, што дзеці імкнуліся гаварыць па-беларуску ў розных "неафіцыйных" сітуацыях: дапаўняючы прамоўцаў, у час гульняў ці проста паміж сабой.

Вядома, што перакананні чалавека развіваюцца на аснове яго поглядаў і пачуццяў у працэсе актыўнай дзейнасці ў пэўным напрамку. Думаецца, што актыўны ўдзел рабят у падрыхтоўцы і правядзенні "Беларускай гасцёўні" нямала садзейнічаў таму, каб закласці асновы цвёрдым нацыянальным перакананням асобы. Калі работа ў гэтым напрамку будзе працягвацца так паспяхова і плённа, як у дадзеным выпадку, можна будзе чакаць і адпаведных паводзін дзяцей.

**С.ВАЛЬЧАНКА,**
**аспірантка кафедры педагогікі.**



Так выглядае герб універсітэта г.Абердзіна.

# ЖЫЦЦЁ СТУДЭНЦКАГА ГАРАДКА Ў АБЕРДЗІНЕ

**На старонках нашай газеты ўжо расказвалася аб летнім падарожжы народнай капэлы "Дзянніца" на фестываль мастацтваў у Шатландыю. Сёння -- чарговая публікацыя.**

Студэнцкі гарадок знаходзіцца ў пятнаццаці хвілінах хадзьбы ад вучэбных карпусоў. Вузкія вулачкі, па абодвух баках якіх размяшчаюцца катэджы заможных абердзінцаў, хутка выводзяць вас ва універсітэцкі парк з паплавамі і зацішнымі месцамі для ціхага адпачынку. Перад вамі дылема: прайсціся па парку, паназіраць за шатландскай флорай і фаунай або хутка падняцца па асфальце ўгору ў свой трохпавярховы корпус. Нас адразу папярэдзілі: у позні час сутак ў парк не хадзіць, каб пазбегнуць сустрэч з асобнымі шукальнікамі прыгод.

Інтэрнат студэнтаў пабудаваны такім чынам: будынак падзелены на блокі, у кожным з якіх па шэсць аднамясцовых нумароў, кухня, два туалеты; душ сумешчаны з умывальным пакоем, у якім адначасова могуць умывацца 3 чалавекі і глядзецца ў вялікае люстэрка. Нягледзячы на спякотнае лета, гэты пакой ацяпляўся. Для прывядзення ў парадак умывальнага пакоя прадугледжаны набор швабр з механічнай адціскалкай, якая дазваляе не пэцкаць рукі. На кухні стаіць вялікі абедзенны стол, набор крэслаў, гладзільная дошка са спецыяльным неўзгаральным пакрыццём, электрапліта, дзве кавеваркі з аўтаматычным выключальнікам. Такім жа выключальнікам аснашчаны і прас. Кухонныя сталы-шафкі ствараюць прастору, у якой свабодна можна займацца прыгатаваннем ежы, мыццём посуду, сервіроўкай стала. Вёдры для смецця на кухні адсутнічаюць, таму што крайні правы стол-шафка, прымацаваны да мыйкі, мае прыстасаванне, у якім заціскаецца поліэтыленавы пакет чорнага колеру для збору адыходаў.

Асабісты пакой студэнтаў невялікі. У ім -- стандартная мэбля: драўляны ложак з паралонавым матрацам і з плоскай падушкай, наборам добрай бялізны, якую мяняюць горнічныя, а студэнт не займаецца гэтымі праблемамі ніколі; пісьмовы стол, настольная лямпа, над сталом кніжныя паліцы; крэслы; шафа для бялізны з расстаўляльнымі створкамі. На кніжнай паліцы, у кожным пакоі знаходзяцца Біблії, якія пераходзяць ад аднаго студэнта да другога. Усе Біблії ў добрым стане.

Уборкай памяшканняў, зменай бялізны, запраўкай ложкаў штодзённа займаюцца горнічныя, якія па графіку абыходзяць усе блокі корпуса. Кожны студэнт мае ключ, які адкрывае дзверы ў блок і пакой, але не падыходзіць да іншых пакояў. У выпадку страты ключа або выпадковай сітуацыі, калі ключ застаўся на стале, а вы зачынілі дзверы, можна звярнуцца да дзяжурнага па гарадку, які адкрывае дзверы, дасць запасны ключ /ён каштуе 3,5 фунта/.

З гарадка па спецыяльнаму графіку ходзяць маршрутныя аўтобусы. Асабліва добра арганізаваны ўсе масавыя мерапрыемствы, калі аўтобусы адвозяць студэнтаў у тэатр, канцэртны зал на графскія прыёмы, а потым дастаўляюць іх у студэнцкі гарадок. Усе прыёмы і масавыя мерапрыемствы ажыццяўляюцца па запрашэннях або нагрудных візітках з каляровымі фотаздымкамі ўладальніка. Па гэтых жа візітках студэнты праходзяць у сталовую. У сталовых арганізавана трохразовае харчаванне па сістэме самаабслугоўвання, але па тыповаму набору страў, з якіх кожны выбірае іх на свой густ. Так, на сняданкі прапануюцца шматкі розных злакавых культур, звычайна чатырох відаў. Адна сумесь -- з аўсяных шматкоў з арэхамі і разынкамі. Студэнт накладвае гэтыя шматкі ў місачку, а малако ў гарлачыках стаіць на вялікіх абедзенных сталах. Малако наліваюць па жаданню, яно не абмежавана. Акрамя таго, да сняданка бяруць некалькі кавалачкаў падсмажанага хлеба, шклянку соку, мармелад або джэм, масла, якія таксама стаяць на стале. Каву або чай студэнт у канцы сняданка атрымлівае каля спецыяльнай стойкі, дзе абавязкова вас спытаюць, з якім цукрам -- белым або карычневым -- вы будзеце піць. Студэнты харчуюцца па раніцах і самастойна. Для гэтага ў гарадку ёсць магазін, у якім можна знайсці ўсё, пачынаючы ад напояў у розных упакоўках да ўсемагчымых далікатэсаў. Тут жа можна купіць рознага віду скорасшывальнікі для курсавых, алфавітныя сшыткі для канспектавання і складання спісу выкарыстанай літаратуры або падабраць падарунак да дня нараджэння.

Часцей студэнты абедаюць у новай сталовай, якая знаходзіцца ў комплексе вучэбных карпусоў. Тут таксама самаабслугоўванне. Сам паток пачынаецца з атрымання другой стравы. Выбіраеш адно з трох, часам вельмі экзатычных. Часцей гэта страва з мяса, другая -- з рыбы і трэцяя -- з яек. Затым паток падзяляецца: адны студэнты ідуць налева, другія -- направа і атрымліваюць складаны гарнір да другой стравы, затым салат або суп, салодкае або йогурт, каву або сок, цукар і соусы ўжо ва ўпакоўцы дапаўняюць ваш абед. Пасля абеду паднос з посудам ставіцца на спецыяльныя шматпалічныя кантэйнеры на колах, якія па меры напаўнення ўвозяць дзяжурныя работнікі сталовай.

Вячэраюць студэнты ў студэнцкім гарадку таксама па комплекснаму меню. Затым адкрываюцца бары, дзе можна выпіць соку, піва, спіртное. Пазней усе могуць патанцаваць. Дыскатэка збірае больш 200 чалавек, але праходзіць яна пад наглядам служачых з аховы парадку студэнцкага гарадка. Сталовая, бары, дыскатэка, пошта, перагаворачны пункт, служба рассялення, служба інфармацыі знаходзяцца ў адным будынку і працуюць зладжана.

Вопратка студэнтаў разнастайная, манеры свабодныя, яны хутка ўваходзяць у кантакт з моладдзю іншых краін і разумеюць адзін аднаго.

**Э.ЛІЗАРАВА,**
**альт капэлы "Дзянніца".**



Да 100-годдзя кіно

# ТАЛЕНТ І ТОЛЬКІ ТАЛЕНТ

*У канцы снежня споўніцца 100 гадоў кінематографу. Ніхто не будзе аспрэчваць, што кіно стала па-сапраўднаму самым масавым відам мастацтва, яго любяць усе без выключэння. І ў кожнага з нас ёсць любімыя артысты, сустрэча з якімі на кінаэкране прыносіць вялікую радасць і захапленне.*

*Сёння наш расказ пра вядомую зорку французскага кіно, якую добра ведаюць у нас, актрысу Ані Жырардо.*

У аўтарытэтным кінадаведніку пра яе сказана: "Яна зрабіла цудоўную кар"еру як на сцэне, так і на экране дзякуючы свайму выдатнаму таленту". Актрыса без легенды, без шлейфа свецкай хронікі, а таксама без свайго рэжысёра, яна магла разлічваць толькі на сябе.

"Самая французская з усіх французскіх актрыс", як яе называюць суайчыннікі, Ані Жырардо нарадзілася 25 кастрычніка 1931 года. З кансерваторыі трапіла ў "Комеди Франсэз" і ўжо праз год пасля дэбюту ўдастоілася прэміі Сюзаны Б"яншэці як лепшая маладая актрыса 1956 года. Жан Както, прызнаны кароль мастацкага авангарда, у вечар генеральнай рэпетыцыі сваёй п"есы "Пішучая машынка" у "Комеди Франсэз" ледзь не задушыў яе ў абдымках, заявіўшы на зайздрасць іншым: "Жырардо -- лепшы драматычны талент апошніх гадоў". Потым была цікавая работа з Жанам Марэ ў спектаклі "Двое на арэлях" У.Гібсана, якую паставіў Лукіна Вісконці. Праз год, у 1960 годзе ён даў ёй ролю, аб якой іншыя актрысы мараць усё жыццё: Жырардо выканала ролю Надзі ў яго фільме "Рока і яго браты". Далей пайшла лавіна запрашэнняў: штогод яна паспявала зняцца ў трох-чатырох карцінах і абавязкова іграла ў тэатры. Нягледзячы на тое, што Ані давялося працаваць з такімі цудоўнымі кінаакцёрамі як Бельмандо, Жан Габэн, Вентура, Дэпардзье, Ален Дэлон, Філіп Нуарэ, з рэжысёрамі ёй не шанцавала. Рэне, Труфо, Годар, Маль, іншыя рэжысёры "новай хвалі" не заўважылі Ані Жырардо. Буйных роляў яна сыграла ў дзесяць разоў менш, чым дазваляў ёй "цудоўны талент".

Не так даўно Ані знялася ў нашага рэжысёра Валерыя Ахадава ў фільме "Руфь", прадставіўшым гісторыю французскай піяністкі Веры Лотар-Шаўчэнка, якая ў 30-я гады ў Парыжы выйшла замуж за савецкага дыпламата і прыехала з ім у СССР. Але сапраўдным сюрпрызам нашым прыхільнікам творчасці Ані Жырардо і драматычнага мастацтва ў цэлым стала выступленне французскай актрысы на падмостках маскоўскага Тэатра Сатыры ў монаспектаклі "Мадам Маргарыта" у мінулым годзе.

Зараз Ані знялася ў Клода Лелюша ў сучаснай тэлеверсіі "Адрынутых", на чарзе -- работа з гэтым жа майстрам над новым телесерыялам. Жырардо не сумуе. Дачка, унукі, сябры, любімая работа -- вось простыя складаючыя яе зямнога чалавечага шчасця. А наконт розных размоў аб "зоркавасці" Ані Жырардо аднойчы мудра заўважыла: "Калі ты зорка, табе месца на небе, а не на Зямлі".

**В.БОРТНІК, студэнт 5 курса**
**філалагічнага факультэта.**

Лідэр

# МО - ДО

*Матэрыял, які прапануецца вашай увазе сёння, -- я адрасую аматарам танцавальнай музыкі. Гэтым артыкулам мы пачынаем цыкл матэрыялаў, напісаных па заяўках нашых пастаянных чытачоў рубрыкі "Лідэр".*

Восень і зіма 1994 года і першая палова 1995 г. прайшлі пад гукі: "Айн, цвай -- паліцай" і "Гема Дансинг", якія выконваліся на нямецкай мове "высокім бландзінам з блакітнымі вачыма". Абедзьве мелодыі сталі суперпапулярнымі на ўсіх дыскатэках! І ўсё гэта -- да выхаду першага паўнацэннага альбома! Міньён з дзвюма песнямі разышоўся тыражом у некалькі мільёнаў экземпляраў і амаль чатыры месяцы ўзначальваў спісы папулярнасці ў многіх краінах Еўропы, дастойна канкурыруючы з "І-Тайп". Чым жа можна растлумачыць феномен Мо-До, які спявае на нямецкай і, здавалася б, першапачаткова не канкурэнтназдольнага з англамоўнымі выканаўцамі?

А ўсё тлумачыцца вельмі проста: спявак працуе ў вечным стандарце стылю Еўра-поп. Аснова гэтага стылю была закладзена творчасцю групы "Шокин Блю" у 70-я гады. Далей былі "АВВА", "Бони М", пазней з"явіліся "Калче Бит" і "Ту Анлимитед". Еўра-поп -- гэта нават не стыль, а накірунак ў камерцыйнай музыцы, асноўная стаўка ў якой робіцца на нескладаныя мелодыі, якія лёгка запамінаюцца і адразу "асуджаны" на поспех у слухачоў і пастаянных наведвальнікаў дыскатэк. Большасць груп, працуючых у гэтым накірунку, грунтоўна прадумваюць драбнейшыя дэталі свайго экзатычнага аблічча для стварэння відовішчнага і маляўнічага танцавальнага шоу. Праўда, гэта частка айсберга схавана ад іншых вачэй: групу "Снэп", напрыклад, ведаюць усе аматары дэнса, а вось імя Майкла Мюнцыга -- менеджэра групы, які займаўся да таго ж распрацоўкай сцэнічнага іміджа калектыву, не ведае амаль ніхто. Гэта і не дзіўна: бізнесмены стараюцца не афішаваць сваю дзейнасць. Іменна Мюнцыг і дапамог Мо-До пачаць свой шлях на сцэне. Іменна ён дапамог з раскруткай. Аб самім Мо-До таксама вядома няшмат: нарадзіўся ў 1967 годзе ў Італіі, сапраўднае імя Фабіо Фрытэллі. І хаця ён спявае /а дакладней "шпарыць" скорагаворкай па-нямецку/, немцамі ў яго родзе былі толькі бабуля і дзядуля. Сёння "на ліку" у Мо-До дзесяткі кліпаў, тры альбомы /у адным з якіх замест рэпаўскіх хітоў ён выконвае некалькі лірычных балад на англійскай мове/. "Я многае хачў паспець. У мяне шмат творчых планаў, мноства арыгінальных задум", -- гаворыць Мо-До. Як яны ўвасобяцца -- пакажа час. А пакуль... паставім любую музычную праграму на кампакт-дыскі з песнямі Мо-До і паспрабуем зрабіць "танцавальную вечарынку": таму што яго музыка ідэальна падыходзіць для адпачынку.

**П.БЕСЯЦКІ,**
**вядучы рубрыкі**
**"Лідэр".**

# ПРЫСВЕЧАНЫ ВЫЗВАЛЕННЮ ГОМЕЛЯ

26-га лістапада гамяльчане і нашы госці ўрачыста адзначылі 52-ю гадавіну з дня вызвалення Гомеля ад гітлераўскіх акупантаў. Гэтай даце былі прысвечаны масавыя лёгкаатлетычныя забегі. Паспяхова выступілі ў іх студэнты факультэта фізічнай культуры нашага універсітэта. На 5-кіламетровай дыстанцыі перамаглі майстры спорту Аляксандр Цітоў і Алена Бычкоўская.

У забегу на 10000 м лепшы вынік паказаў кандыдат у майстры спорту Сяргей Цішкоў, а Віталь Жукаў на фінішы быў другім.

Запрашае цырк

## СЮРПРЫЗЫ НАВАГОДНЯЙ АРЭНЫ

Новая святочная праграма пад такой назвай уладарыць цяпер у Гомельскім цырку.

*Нас часто в цирке ждут*
*приятные сюрпризы,*
*И уж, конечно, их не счесть*
*под Новый год.*
*От трюка смелого до*
*клоунской репризы --*
*Всё удивляет здесь и за душу*
*берёт!*

Гэтыя паэтычныя радкі, якія глядач прачытае на праграмцы новага прадстаўлення, вельмі дакладна адлюстроўваюць ўсё тое, што адбываецца на манежы. Нібыта яркі і маляўнічы калейдаскоп паўстае перад гледачом: гімнасты, жанглёры, эквілібрысты, акрабаты захапляюць сваім майстэрствам, спрытам, грацыёзнасцю; коні, бурыя сібірскія мядзведзі, сабакі, кошкі і іншыя жывёлы пад кіраўніцтвам дрэсіроўшчыц Вольгі Ільіной і Тамары Вінаградавай паслухмяна выконваюць самыя разнастайныя трукі, а некаторыя з іх нават здзіўляюць сваімі здольнасцямі ў... матэматыцы. Асабліва хвалюе і казыча нашы нервы нумар "Індыйская ёга": ад трукаў яго выканаўцаў з бітым шклом, вострымі нажамі і цвікамі, глытаннем агню перахоплівае дыханне.

Усе асобныя выступленні артыстаў "звязвае" у адзін непарыўны ланцужок вясёлы і дасціпны клоун Аляксандр Картукоў, які асабліва прыводзіць у захапленне дзяцей.




І,. бадай, кульмінацыйны момант праграмы -- атракцыён "Афрыканскія плямістыя гепарды" пад кіраўніцтвам Марыны Маяцкай. Дзіву даешся, як гэтыя дзікія жывёлы афрыканскіх саванн так паслухмяна падпарадкоўваюцца сваёй элегантнай, грацыёзнай гаспадыні, якая выглядае на арэне сапраўднай амазонкай. Няцяжка ўявіць сабе, якая карпатлівая праца стаіць за гэтым атракцыёнам: дрэсіроўшчыца першай у гісторыі цырка рызыкнула ўтаймаваць хутчэйшага за ўсіх звяроў у свеце -- гепарда.

Спяшайцеся ў цырк на прагляд новай праграмы, і вы атрымаеце шмат прыемных і хвалюючых мінут!

**Т.НІКАЛАЕВА.**

## У РЭДАКЦЫЙНАЙ ПОШЦЕ -- ПАЭЗІЯ

*Владимир ИВАНОВ, выпускник геолого-географического факультета.*

* * *

*Я по пушкинским местам бродил,*
*Замирала с трепетом душа.*
*Мне казалось, что он рядом был*
*И читал стихи мне, неспеша.*
*Меня воздух времени пьянил,*
*Уходила из-под ног земля.*
*И я Имя, Родину забыл,*
*Был уверен: здесь родился я,*
*Здесь взрослел и первую любовь*
*Встретил здесь среди зелёных древ;*
*Здесь же и застыла в жилах кровь,*
*Неприемля дерзкий женский гнев.*
*И перчатка белая в лицо,*
*И оскал ехидный дуэлянта.*
*Кто убил, остался подлецом,*
*Кто погиб, останется талантом.*
*И листва осенняя грустит,*
*Мелкий дождь её терзает нежно.*
*И дубрава в эту ночь не спит,*
*Умерла последняя надежда.*

* * *

*Уж канул в лету век дуэлей,*
*Век романтической любви,*
*Век поэтических творений,*
*Я господа прошу -- верни.*
*Пожалуйста, верни то время,*
*Когда жил Пушкин, жил Дантес,*
*Брось в землю прошлой жизни семя,*
*Верни всех "узников небес",*
*С их возвращением наступит*
*Благопристойная пора*
*И не любящий вмиг полюбит,*
*Сойдётся вдруг с горой гора.*
*Вернутся Честь и Благородство*
*И всё-таки взойдёт Звезда,*
*Убогость наша и уродство*
*Покинут землю навсегда.*

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб"яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- вышэйшай матэматыкі -- дацэнта;

-- рускай мовы для замежных навучэнцаў -- асістэнта.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699 г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты фізічнага факультэта, калектыў кафедры агульнай фізікі выказваюць глыбокае спачуванне намесніку дэкана **ЖАЛОНКІНАЙ Тамары Пятроўне** з выпадку напаткаўшага яе гора -- смерці **МАЦІ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў матэматычнага факультэта выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту кафедры ВМ і праграміравання **БЫХАЎЦАВУ Віктару Емяльянавічу** з выпадку напаткаўшага яго гора -- смерці **МАЦІ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул, Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 221
Спонсары газеты -- НВП "Сучасныя тэхналогіі", прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на Гомельскай фабрыцы "Паледрук", г.Гомель, вул.Савецкая, 1.
За няякасны набор, вёрстку і памылкі фабрыка "Паледрук" адказнасці не нясе.

Рэдактар
Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ 682.
Падпісана да друку 01.12.95.